Аўторак, 30 Лістапад 2021

«Каналізацыйны калектар – не грамадскае месца». Юлія Алейнік, якую судзілі за надпіс «БЧБ Жыве», абскардзіла прысуд

Друкаваць (/news/sud/item/4301-abskardzila-prysud?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=b1c1fe71c11f091fd9750329474990324f6933ce)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/6b14559365a816474b65b8277789c59d_XL.jpg)

Калектар, на якім быў зроблены надпіс

У Віцебскім абласным судзе 30 лістапада адбыўся разгляд апеляцыйнай скаргі Юліі Алейнік і яе адваката на рашэнне суду Кастрычніцкага раёну Віцебску, які аштрафаваў (/news/sud/item/4193-2610-rubljou-shtrafu) яе на 90 базавых велічыняў за надпіс «БЧБ Жыве» на каналізацыйным калектары ў Віцебску. Суддзя Сняжана Кіндзеева палічыла яе вінаватай у пашкоджанні маёмасці (арт. 341 КК РБ). Незадоўга да суду яе адлічылі з мастацка-графічнага факультэту («худграф») ВДУ.

На разгляд скаргі ў абласны суд **Юлія Алейнік** не пайшла. Патлумачыла, што ейная прысутнасць наўрад ці паўплывае на вынік. Рашэнне прымала калегія па крымінальных справах у складзе суддзяў **Андрэя Прэйса** і **Ларысы Сініцынай**.

На працэсе, які пачаўся 27 верасня ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску, Юлія заяўляла, што нанесла надпіс на каналізацыйным калектары, каб падтрымаць людзей, якія маюць такія ж погляды, як яна. У сваёй скарзе таксама зазначыла, што, *«робячы надпісы, ажыццяўляла сваё неад'емнае права на свабоду меркаванняў»*.

Дзяўчына спаслалася на Канстытуцыю і заявіла, што *«сваімі дзеяннямі не замахвалася на інтарэсы дзяржаўнай і грамадскай бяспекі»*. Звярнула ўвагу суддзяў, што надпісы былі праз некалькі дзён зафарбаваныя, і на тое, што каналізацыйны калектар не з'яўляецца грамадскім месцам.

Аднак пракурор **Аляксей Бізуноў** меў супрацьлеглае меркаванне пра каналізацыйны калектар. Маўляў, ён знаходзіцца на балансе Віцебскага водаканалу, і міма яго ходзяць людзі. *«Судом дакладна вызначана, што сэнсавы змест надпісаў скіраваны на прычыненне шкоды грамадскаму парадку і грамадскай маральнасці, зніжае эстэтычнае ўспрыманне названага аб'екта»*, – заявіў пракурор. І папрасіў калегію пакінуць прысуд суду Кастрычніцкага раёну без зменаў, а апеляцыйную скаргу адхіліць.

Пасля невялікага перапынку судовая калегія пастанавіла: *«Прысуд у дачыненні Алейнік пакінуць без зменаў, а апеляцыйную скаргу абвінавачанай і яе абаронцы без задавальнення»*.

Надпіс «БЧБ Жыве» Юлія зрабіла 30 траўня на каналізацыйным калектары, размешчаным паміж вуліцай Праўды і праспектам Фрунзе ў Віцебску. «Водаканал», якому належыць гэты аб'ект, налічыў шкоду ў памеры 28 рублёў 17 капеек. Да пачатку працэсу дзяўчына кампенсавала заяўленую суму. Пасля прысуду яна заявіла, што прызначаны штраф у памеры 90 базавых велічыняў для яе «непад'ёмны» і дзе ўзяць грошы яна не ведае. З універсітэту яе адлічылі, з інтэрнату – выселілі.

Уладзімір Бяляўскі

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: Юлія Алейнік (/itemlist/tag/Юлія%20Алейнік) абласны суд (/itemlist/tag/абласны%20суд) Андрэй Прэйс (/itemlist/tag/Андрэй%20Прэйс) артыкул 341 КК (/itemlist/tag/артыкул%20341%20КК) Аляксей Бізуноў (/itemlist/tag/Аляксей%20Бізуноў)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Уладзіміра Булаўскага асудзілі на 7 сутак арышту (/news/sud/item/4300-uladzimira-bulauskaga-asudzili-na-7-sutak-aryshtu-za-shto-dakladna-nevyadoma) Паўтара года «хіміі» – за чарговую абразу даішніка Ігара Вольніча. Прысуд набыў законную моц » (/news/sud/item/4302-pautara-goda-khimii)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/4301-abskardzila-prysud#startOfPageId4301)

© 2011 - 2024 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/